Падтрымай "Вясну" на PATREON

Андрэй Павук: “Мяне затрымалі за супрацу з Белсатам” дапоўнена

24.07.2018 **Тэгі**: затрыманні



Андрэй Павук. Фота з сацыяльных сетак

Акцябрскі блогер **Андрэй Павук** паведаміў 24 ліпеня на ўласнай старонцы ў фэйсбуку: “Мяне затрымалі за супрацу з Белсатам”. І дадаў, што інспектар узбудзіўся з-за тэга “Андрей Павук” пад навіной на сайце “Белсат”.

Праваабаронцам ён патлумачыў па тэлефоне, што раніцай, прыкладна ў 9-15, яго выклікалі па тэлефоне ў РАУС даць тлумачэнне па нейкай адміністрацыйнай справе. Аднак ён адмовіўся ад прапановы супрацоўнікаў міліцыі. Тады яго затрымалі і адвезлі ў аддзяленне міліцыі, дзе ўчастковы інспектар Віктар Карпянок склаў пратакол затрымання.

Па словах Андрэя Павука, яго хочуць абвінаваціць у парушэнні артыкула 22.9 КаАП (незаконны выраб прадукцыі СМІ). Нібыта ён апытваў людзей пра сваю майку з выявамі мясцовых чыноўнікаў.

Раней паведамлялася, што супрацоўнікі Акцябрскага РАУСа распачалі супраць Андрэя Павука адміністрацыйны працэс паводле заяваў намесніка старшыні райвыканкама **Уладзіміра Елісеева** і кіраўніцы спраў **Валянціны Шлапаковай**. Чыноўнікі сцвярджаюць, што блогер абразіў іх гонар і зганьбіў пачуцці сям'і, калі змясціў іх выявы на цішотцы.

Ранкам Павук меў намер стрыміць выязное пасяджэнне раённых чыноўнікаў з удзелам дэпутата Палаты прадстаўнікоў. Магчыма гэта і паслужыла падставай для ягонага затрымання. Тым не менеў пратакол адміністрацыйнага правапарушэння быў на блогера складзены.

Твитнуть





Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы


Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO






















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY